# ДА ПРАБЛЕМЫ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ, НЕ АКУПІРАВАНАЙ КАЙЗЕРАЎСКІМІ ВОЙСКАМІ (1915 – ЛЮТЫ 1917 Г.)

І. М. Рыжанкоў, дацэнт;
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

Для беларускага грамадства цікавым і карысным вопытам падаецца асвятленне становішча сялянскай гаспадаркі ва ўмовах разгортвання Першай сусветнай вайны, удзел сялянства ва ўсталяванні новага ладу, вырашэнні эканамічных і іншых праблем. Разам з навуковымі высновамі прыводзяцца ўзоры сацыяльных настрояў і паводзін працоўных мас у адносінах да грамадства і дзяржавы.

Першая сусветная вайна агарнула сваімі бедамі звыш 4,1 млн. сялян неакупіраванай немцамі ўсходняй часткі Беларусі – у складзе Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. З улікам Ашмянскага, Вілейскага, Дзісненскага паветаў Віленскай губерні колькасць сялян складала каля 4,5 млн. З трох абазначаных губерняў Мінская заставалася найбольш развітай эканамічна, тут жа размяшчаліся буйныя панскія латыфундыі. У лік асноўных заняткаў сялян уваходзілі: раслінаводства (жыта, авёс, ячмень, пшаніца, грачыха, гарох, лён, каноплі, бульба, морква, капуста, буракі і інш.), мясамалочная (буйнарагатая) і іншая (коні, свінні, авечкі) жывёлагадоўля, развядзенне хатняй птушкі і інш. Асноўная цяжкасць, якую перажывала як сялянская, так і памешчыцкая гаспадарка – гэта недахоп рабочых рук па прычыне вайсковых мабілізацый. Да лютага 1917 г. з беларускіх губерняў было мабілізавана каля паловы вясковых работнікаў. Па магчымасці, клопат аб палетках “сялянскіх сем’яў, дзе не засталося работнікаў”, ускладаўся на вясковыя грамадствы [1]. У дадатак, выкарыстоўвалася праца ваеннапалонных, бежанцаў, “іншародцаў” (кітайцаў, карэйцаў, бурятаў і інш.), накіраваных у прыфрантавыя раёны Беларусі. У той самы час, гэта не вырашыла праблемы скарачэння пасеваў. Дэфіцыт працоўных рук вымушаў землеўладальнікаў і буйных арандатараў здаваць свае палеткі (ворную зямлю, пашы, сенакосы) у арэнду сялянам бліжэйшых вёсак. Беззямельныя сяляне, а таксама бежанцы мелі магчымасць наняцца на працу на выгадных для сябе ўмовах, што вызначыла рост аплаты працы парабкаў і зменшыла рэнтабельнасць вытворчасці прадукцыі. Акрамя таго, прыфрантавое вясковае насельніцтва прыцягвалася вайсковымі і цывільнымі інстанцыямі на будаўнічыя, рамонтныя, лесанарыхтоўчыя, ахоўныя работы, дастаўку паліва на чыгунку і інш. Натуральна, што адрыў сялян ад гаспадарчых клопатаў негатыўна адбіўся на аб’ёме вытворчасці прадуктаў харчавання. У прыватнасці, Мінская губерня ў тры разы больш іх спажывала, чым выпрацоўвала. У Магілёўскай губерні адчуваўся недахоп хлеба, паколькі толькі чвэрць зямлі была занята бульбай,

збожжавымі і іншымі культурамі, а астатняя забяспечвала патрэбы мясамалочнай вытворчасці. Царскі ўрад па-магчымасці спрабаваў аказаць дапамогу мясцовым гаспадаркам, якія адчулі недахоп у насенні. Так, напачатку 1916 г. урад прадставіў Міншчыне насення каля 1 млн. пуд. (авёс і ячмень) для продажу па нарыхтоўчай цане [2].

Жорсткая рэгламентацыя жыцця прыфрантавых губерняў, умовы ваеннага часу не здолелі суіснаваць разам з рынкавымі законамі. Няспынна нарасталі дэфіцыт і дарагоўля спажывецкіх тавараў у дадатку з прагрэсіраваўшай інфляцыяй. На старонках газеты “День” ад 17 лютага 1917 г. міністр земляробства А.А. Рыцціх адзначаў, што “паступленні на патрэбы арміі і абароны з жніўня па лістапад (1916 г.) далі моцны недабор”, а цвёрдыя цэны на хлеб адсталі ад рынкавых. У прыватнасці, у параўнанні з 1916 г., рыначныя цэны на мяса, бульбу, яйкі, авёс і іншыя прадукты выраслі ў 1,5 – 2,5 разы.

Відавочна, сістэма цэнтралізаваных паставак хлеба ў Расіі пачала даваць збоі, і таму мясцовыя ўлады сталі часцей звяртаць увагу на мясцовыя рэсурсы. Нарыхтоўчыя інтэнданцкія службы Паўночнага і Заходняга франтоў павінны былі даставіць не менш 6 млн. пуд. бульбы, 150 тыс. пуд. буракоў, 100 тыс. пуд. капусты, па 50 тыс. пуд. морквы, рэдзькі і рэпы. Асноўнымі паўнамоцтвамі па харчовых нарыхтоўках карысталіся службы губернскіх “упаўнаважаных міністэрства земляробства па нарыхтоўцы хлеба для патрэб арміі”. У іх жа кампетэнцыі знаходзіліся “усе справы па рэквізіцыях жывёлы, збожжавага хлеба і фуража як для патрэб арміі, так і для харчавання мясцовага насельніцтва”. Асобна, але ў кантакце з імі, дзейнічалі губернскія харчовыя камісіі, франтавыя, гарнізонныя інтэнданцтвы. Уласныя каналы набыцця і рэалізацыі прадуктаў мелі арганізацыі Усерасійскага земскага саюза (УЗС), Усерасійскага саюза гарадоў (УСГ) і інш. Як паведамляў правадыр Пінскага дваранства ад 18 сакавіка 1916 г., загадам галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту абмяжоўваліся рэквізіцыі, каб пакінуць на кожны сялянскі двор адну пару рабочых коняў або валоў у залежнасці ад памераў ворыўных зямель [3]. Пэўная частка хлеба (жыта, аўса і інш.) нарыхтоўвалася на месцах метадам “развёрсткі” па “цвёрдай” цане, прычым, самі вяскоўцы дастаўлялі яго ў гарадскія “ссыпныя магазіны” па норме, вызначанай земскімі ўправамі на аснове інфармацыі аб магчымасцях сялянскай гаспадаркі (колькасць зямлі, пашы, жывёлы, едакоў і г. д.). Так, у адпаведнасці з пастановай Міністра земляробства за № 66 ад 29 лістапада 1916 г. “Аб развёрстцы збожжавых хлябоў і фуражу”, да вясны новага года сялянства Рэчыцкага павета ссыпала ў магазіны 72423 пуд., Мазырскага – 29572 пуд. і 33 ф. (па цане 1 рубель 95 капеек за пуд). Сялянства Мінскага павета ссыпала 52310 пуд. жыта, Бабруйскага – 63544 пуд. 26 ф., Барысаўскага – 37492 пуд. і 15 ф., Ігуменскага – 75421 пуд. і 12 ф., Навагрудскага – 8118 пуд. і 27 ф., Слуцкага – 52883 пуд. (па цане 2 руб. 13 капеек за пуд) [4]. Да 1 сакавіка 1917 г. па заданні ўпаўнаважанага па закупцы хлеба для арміі па Віцебскай губ. Дрысенская

павятовая ўправа "развярстала" па 17 валасцях 27035 пудоў аўса па цане 1 рубель 80 капеек за пуд.

Між тым, у пачатку 1917 г. сітуацыя з аўсом на Беларусі ўскладнілася настолькі, што галоўны начальнік забеспячэння армій Заходняга фронту генерал Туманаў аддаў загад мінскаму і магілёўскаму губернатарам рэквізаваць запасы (аўса) у буйных землеўладальнікаў. Нарыхтоўчыя службы вызначалі для рэквізіцыі жывёлы тыя гаспадаркі, дзе мелася лішняе пагалоўе. За час вайны, на Магілёўшчыне было рэквізавана толькі 46 % коней, і таму на пачатку 1917 г. тут праводзілася адпаведная праца. Так, у Аршанскім павеце належала рэквізаваць 870 коней, а таксама 22 каровы і 2 цяляці. У Мінскай губерні з лютага па май 1917 г. належала рэквізаваць 6000 галоў. Што тычыцца буйнарагатай жывёлы, то губернскай земскай управе ўдалося пераканаць урад у мэтазгоднасці яе рэквізіцыі (97000 галоў) у іншых губернях. Варта заўважыць, што ваенныя ўлады, нягледзячы на пэўны саслоўны "імунітэт" дваранства, імкнуліся падпарадкаваць усе рэсурсы, у тым ліку і памешчыцкія, на патрэбу фронта.

Дзякуючы адладжанай сістэме кіравання, узмоцненай законамі ваеннага часу, вышэйшае камандаванне, упаўнаважаныя Міністэрства земляробства, губернская адміністрацыя, земскія ўправы валодалі неабходнай інфармацыяй аб харчовым становішчы края, яго працоўных рэсурсах і г. д. Паводле зацверджанага царскім урадам "парадку пастаўкі збожжавых хлябоў і фуража", рэквізіцыі адбываліся шляхам пакупкі прадуктаў (хлеба, мяса, фуражу) у вытворцаў (сялян, памешчыкаў, арандатараў) па фіксаваных цвёрдых цэнах. Іншая справа, што самі вытворцы не былі зацікаўлены ў яе продажы па такіх цэнах, якія значна саступалі рыначным. У выніку, як памешчыкі, так і сяляне імкнуліся ўхіліцца ад рэквізіцый і ў выпадку неабходнасці прадаць хлеб перакупшчыкам. Але калі першыя маглі рабіць гэта без рызыкі быць пакаранымі, то апошнія, пасля раскрыцця падману, падлягалі санкцыям у выглядзе адабрання ўтоеных прадуктаў з кампенсацыяй 85 % ад іх кошту па цвёрдай цане. Але, нягледзячы на перашкоды, сяляне актыўна гандлявалі збожжам. Як паведамлялі з Бялыніцкай воласці Магілёўскай губерні, у сярэдзіне лютага 1917 г. у вёсках, хутарах, маёнтках назіралася масавая скупка хлеба сялянамі з Мінскай губерні па двайной цане.

Пад канец 1916 г. разгарнулася таемнае самагонаварэнне. Як паведамляў 10 лютага лепельскі іспраўнік, "у горадзе і павеце, з прычыны блізкасці фронту, назіраюцца выпадкі выганкі, захавання і продажу самагонкі", якая, аднак, прызначаецца не для мясцовага спажывання, а галоўным чынам для збыту ў тыле арміі і па вельмі высокай цане [5]. У сакавіку на Віцебшчыне гэта з'ява набыла масавыя памеры. Ва ўмовах уведзенага напрыканцы 1914 г. "сухога закону" і ўзрослага попыту на спіртавыя напоі, самагонаварэнне стала ператварацца ў адну з крыніц даходу для сялян. Беларускія сяляне не выказвалі заўважных праяў нецярпімасці да існаваўшых парадкаў. Вядома, што іх "спажывецкі кошык" не саступаў "кошыку" гарадскіх працоўных або бежанцаў.

Сялянства адчувала вострую патрэбу ў прамысловых таварах, чым у прадуктовых. Дзеці або бацькі, страціўшыя кармільцаў на вайне, мелі сацыяльную падттрымку з боку дзяржавы і апеку сялянскай абшчыны. Валасныя папячыцельствы аказвалі грашовую і харчовую (паёк) дапамогу непаўналетнім (да 17 год) і пажылым (пасля 55 гадоў) членам сям’і мабілізаванага ў войска кармільца. У апошнія месяцы самадзяржаўя з боку сялян не было зафіксавана ніводнага правапарушэння палітычнага характару, а рэдкія выпадкі аграрнага руху (калі да яго адносіць замахі на панскую або іншую маёмасць) набылі ўстойлівую тэндэнцыю да змяншэння. Калі першую акалічнасць можна растлумачыць суцэльнай апалітычнасцю сялян, то звязваць спыненне аграрнага руху толькі з эфектыўнасцю ваеннапалітычнага рэжыму было б памылкова. Ва ўмовах вайны кан’юктура мясцовага рынку складвалася такім чынам, што ўласная гаспадарка і магчымасць заработку ў маёнтках або на казённых аб’ектах гарантавалі сялянам больш рэальныя шанцы падтрымаць свій дабрабыт, чым імкненне зрабіць гэта за кошт панскага дабра.

Аналіз архіўных дакументаў і сучасных дасягненняў гістарычнай навукі дазваляюць заключыць, што з пачатку вайны лад гаспадарчага, сацыяльнага, духоўнага жыцця сялян застаўся амаль нязменным. Гэтаму спрыяла адсутнасць устойлівых транспартных і інфармацыйных камунікацый як з горадам, так і ў межах павета, але вызначальную ролю адыгрывалі псіхаментальныя асаблівасці беларускага селяніна. Да гэтага часу ён асацыіраваў сябе не з пэўным класам, а выключна са сваім грамадствам (обществом), якое з’яўлялася самадастатковай структурай, куды не было доступу “чужакам” (бежанцам, парабкам і г. д.). Замкнёнаму межамі свайго грамадства беларускаму хлебаробу былі ўласцівы традыцыяналізм, кансерватызм, патрыярхальнасць, законапаслухмянасць, апалітычнасць, талерантнасць, міласэрнасць і іншыя якасці.

Такім чынам, сяляне Беларусі, як і ўсёй імперыі, неслі асноўны цяжар вайны і не выказвалі вострага незадавальнення сваім становішчам. Пазбаўленыя палітычных правоў, за выключэннем “цэнзавай часткі”, вяскоўцы прыкметных шкадаванняў аб тым не выказвалі. Тыя ж з іх, хто быў абраны ў Дзяржаўную думу, не з’яўляліся абаронцамі ні нацыянальных, ні рэгіянальных інтарэсаў, а трапілі пад уплыў расійскіх палітычных партый і груповак. У гэтай сувязі ў ліку прычын, што абумовілі звяржэнне самадзяржаўя, можна назваць многія, але ніяк не рэвалюцыйную ці якую іншую актыўнасць сялянства. Мала таго, новай кіруючай эліце і дэмакратычнай грамадскасці давялося прыкласці шмат намаганняў для таго, каб прыцягнуць вяскоўцаў да ўдзелу ў рэалізацыі харчовых, зямельнага, рабочага, нацыянальнага, грамадскага пытанняў і іншых, якія не былі вырашаны папярэдняй рэвалюцыяй і абвостраных у ходзе сусветнай вайны.

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры:


1. Рыжанкоў, І. М. Становішча беларускага сялянства напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі / І. М. Рыжанкоў // Труды БГТУ. – 2012. – № 5. История, философия, филология. – С. 38 – 40.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Фонд 640. Воп. 2. Спр. 36. А. 85 адв.
3. НАРБ. Фонд 640. Воп. 2. Спр. 37. А. 7.
4. НАРБ. Фонд 640. Воп. 1. Спр. 7. А. 1.
5. НАРБ. Фонд 622. Воп. 1. Спр. 9. А. 83.


## ДАКУМЕНТЫ ВАЕННЫХ КАМІСАРЫЯТАЎ З ФОНДАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ


К. Р. Карпекін, галоўны захавальнік фондаў;
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці


У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца дакументы, якія ўяўляюць цікавасць для вывучэння заключнага этапа Першай сусветнай вайны (1917 – 1918 гг.). У прыватнасці, гэта тычыцца матэрыялаў, якія ўтварыліся ў выніку дзейнасці ваенных камісарыятаў, якія функцыянавалі на неакупаванай германскімі войскамі ўсходняй частцы Віцебскай губерні. За азначаны прамежак часу архіўныя крыніцы ўтрымліваюцца ў фондзе Віцебскага губернскага, 4 павятовых і 17 валасных ваенкаматаў, у якіх справы за 1917 – 1918 гг. складаюць ад 1,7 % да 50 % ад агульнай колькасці адзінак захоўвання ў фондзе. Такія нераўнамерныя паказчыкі звязаны з дрэннай ступенню захаванасці дакументаў па некаторых фондах і рознай інтэнсіўнасцю вядзення справаводства ўстановамі. Найбольш тыповымі дакументамі, якія могуць быць выкарыстаны для даследавання згаданай тэматыкі, з’яўляюцца загады галоўнакамандуючага штабам Заходняй Арміі, загады ваенных камісараў, справаздачы і інфармацыі пра стан вайсковых частак, навучанне навабранцаў, агітацыйную працу сярод ваеннаслужачых, звесткі і перапіска пра ажыццяўленне мабілізацый і рэквізіцый, матэрыяльнае забеспячэнне арміі, барацьбу з дэзерцірствам, апытальныя лісты ваеннапалонных, спісы вайскоўцаў, мабілізаваных, былых афіцэраў царскай арміі, жыхароў валасцей, анкеты супрацоўнікаў ваенкаматаў, ведамасці на выплату заробку.

Першая сусветная вайна стала адной з тых значных геапалітычных падзей, якія абумоўліваюць пачатак новых гістарычных эпох. Барацьба найбольш магутных дзяржаў за падзел сфер уплыву карэнным чынам змяніла накірункі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця грамадства, закранула лёсы мільёнаў чалавек, паўплывала на іх светапогляд.